УДК 75.025.4(476)"19"

# РЭСТАЎРАЦЫЯ ТВОРАЎ ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XX СТ.

***А. А. Трусаў,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** Першыя мясцовыя рэстаўратары музейных прадметаў мастацкага жывапісу з'явіліся ў музеях Мінска, Полацка, Віцебска і Гродна. Так, з'явіліся мастакі па рэстаўрацыі абразоў, фрэсак, скульптуры, станковага жывапісу і металу. Гэта рэстаўратары фрэсак полацкіх храмаў XI–XII стст. Лукашэвіч, Ракіцкі і Маліноўскі. Выбітным мастаком – рэстаўратарам абразоў і паліхромнай скульптуры быў Пётр Журбей. Адным з першых рэстаўратараў беларускай керамікі, і асабліва кафлі, быў Уладзімір Угрыновіч. Вядомы рэстаўратар старадрукаваных кніг – Андрэй Крапіўка. Зараз актыўна працуюць рэстаўрацыйныя майстэрні Нацыянальнага мастацкага музея.

Ключавыя словы: рэстаўрацыя, кансервацыя, сабор, царква, абраз, скульптура, фрэска, жывапіс, мастацтва, кафля.

# RESTORATION OF WORKS OF FINE ART OF BELARUS IN THE SECOND HALF OF THE 20TH CENTURY

***A. Trusau,***
*PhD in History, Associate Professor, Associate Professor of the Historical and Cultural Heritage Department of the Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The first domestic restorers of museum art objects appeared in the museums of Minsk, Polotsk, Vitebsk and Grodno. This is how artists appeared who restored icons, frescoes, sculptures, easel paintings and metal. These are the restorers of the frescoes of Polotsk churches of the 11th–12th centuries: Lukashevich, Rakitsky and Malinovsky. Pyotr Zhurbey was an outstanding artist-restorer of icons and polychrome sculpture. One of the first restorers of Belarusian ceramics, especially tiles, was Vladimir

Ugrinovich. Andrey Krapivka is a famous restorer of early printed books. The restoration workshops of the National Art Museum are now actively working now.

**Keywords:** restoration, conservation, cathedral, church, icon, sculpture, fresco, painting, art, tile.

Спецыялісты разглядаюць жывапіс як помнік мастацтва з дзвюх пунктаў гледжання – эстэтычнага і матэрыяльнага.

Кожны твор жывапісу пад уплывам святла, паветра, тэмпературы і вільгаці, а таксама розных біяразбуральнікаў, паступова разбураецца і патрабуе спецыяльных ахоўных мер па захаванні, кансервацыі і рэстаўрацыі. Жывапісны твор складаецца з паслядоўных этапаў яго стварэння: грунтоўкі, фарбавальнай і пакрыўнай працы.

Некаторыя складаныя жывапісныя кампазіцыі маюць да 10 і болей розных слаёў іх стварэння, якія складаюцца як з арганічных, так і з мінеральных кампанентаў. Рэстаўратары і захавальнікі твораў жывапісу вылучаюць розныя тыпы іх вонкавага парушэння, такія як алькелюр, складкі, адслаенне, уздуцце і інш.

Таму ў працэсе рэстаўрацыі спецыяліст выконвае наступныя працэдуры: ачыстка ад розных забруджванняў ці позніх запісаў, замацаванне фарбавальнага слоя шляхам насычэння твора рознымі матэрыяламі і таніроўка страт як апошні этап рэстаўрацыі.

Кожны рэстаўратар самастойна вырашае, якую аперацыю ў выніку рабіць: лакальнае замацаванне ў месцах фактычнага разбурэння жывапіснай паверхні ці татальнае ўмацаванне паверхні музейнага прадмета. Звычайна татальнае замацаванне робіцца ў выпадку, калі ўвесь жывапісны твор знаходзіцца ў аварыйным стане.

Перад абраннем методыкі рэстаўрацыі неабходны комплексны аналіз існуючых прыёмаў даследаванняў з ужываннем розных прыродна-навуковых метадаў [3].

Асобную частку жывапісу складае сценапіс, роспіс фасадаў і інтэр'ераў будынкаў. У першую чаргу гэта фрэска: а фрэска – роспіс па свежай (вільготнай) тынкоўцы, а сэка – роспіс па сухой тынкоўцы і казеінава-вапнавы жывапіс.

Упершыню фрэскі з'явіліся ў Беларусі ў XI ст. (роспіс Полацкага Сафійскага сабора).

Першыя мясцовыя рэстаўратары музейных прадметаў мастацкага жывапісу (абразоў, скульптуры і графікі) з'явіліся ў музеях Мінска, Полацка, Віцебска і Гродна. У 2012 г. быў выдадзены каталог «Абразы XVII–XIX стст.», у якім даецца апісанне 14 твораў ста-

ражытнабеларускага іканапісу XVIII–XIX стст. з экспазіцыі Мастацкай галерэі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка і 12 твораў XVII–XIX стст. з калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь [1].

Доўгі час рэстаўратараў фрэскавага роспісу ў Беларусі не было. У 1929 г. у Полацку працавала экспедыцыя Маскоўскіх навукова-рэстаўрацыйных майстэрняў на чале з Ігарам Грабаром. Яна зрабіла невялікія расчысткі фрэсак XII ст. у Спаскай царкве Еўфрасіньеўскага манастыра. Таксама спецыялісты з Масквы прыязджалі ў Полацк у 1937, 1939, 1949, 1950 і 1972 гг. Рэстаўратары раскрылі 8 фрагментаў фрэсак – 5 у цэнтральнай частцы і 3 у алтары храма.

У 1969 г. з’явіліся свае мастакі-рэстаўратары ў складзе Спецыяльных навукова-рэстаўрацыйных вытворчых майстэрняў Міністэрства культуры БССР. Сярод іх былі мастакі па рэстаўрацыі абразоў, фрэсак, скульптуры, станковага жывапісу і металу. Так, у 1982 і 1984 гг. рэстаўратары СНРВМ пад кіраўніцтвам Лукашэвіча праводзілі расчыстку фрэсак XI ст., пакрытых вапнавай пабелкай, у інтэр’ерах Полацкай Сафіі. Зробленыя імі зандзіраванні выявілі больш за 50 фрагментаў фрэсак XI ст. у розных месцах сабора. Самыя значныя з іх знаходзяцца ў цэнтральнай апсідзе. З 1992 па 2006 г. рэстаўрацыяй фрэсак XII ст. Спаса-Праабражэнскага храма займаўся беларускі рэстаўратар Уладзімір Ракіцкі. У 2006 г. сюды былі запрошаны спецыялісты з Расіі на чале з Уладзімірам Сарабіянавым.

У другой палове XIX ст. інтэр’еры Спаскай царквы XII ст. расісалі зноў алейнымі фарбамі, якія закрылі фрэскі XII ст. Уладзімір Ракіцкі распрацаваў методыку пераносу позняга жывапісу XIX ст. на спецыяльныя стэнды, якая дазваляе захаваць яго як музейны экспанат. Пачынаючы з 2010 г. па сённяшні дзень працу па рэстаўрацыі фрэсак полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы працягвае Юрый Маліноўскі. Завяршыць рэстаўрацыю ўнікальных фрэсак XII ст. плануюць у 2025 г.

Варта адзначыць, што Уладзімір Ракіцкі і Юрый Маліноўскі 45 гадоў таму выратавалі тры фрэскі XVIII ст. з руінаў каталіцкага кляштара ў Бялынічах. Фрэскі былі зняты са сценаў кармяліцкага кляштара, які ўлады горада вырашылі канчаткова знішчыць у 1978 г. Аднак перад выбухам рэстаўратары паспелі зняць фрэскі разам з тынкоўкай з цагляных сцен будынка. Зараз яны ўпрыгожваюць музейную экспазіцыю.

Выбітным мастаком – рэстаўратарам абразоў і паліхромнай скульптуры з’яўляўся Пётр Журбей. У СССР ён быў адным з лепшых спецыялістаў па аднаўленні драўлянай скульптуры. Таму менавіта яго Усесаюзны інстытут рэстаўрацыі выправіў на аднаўленне старажытнай паліхромнай скульптуры ў Нікарагуа, дзе ён паказаў сябе сапраўдным прафесіяналам. Ён таксама правёў рэстаўрацыю ўнікальнай іконы Божай Маці – галоўнай святыні мінскага Кафедральнага Свята-Духава сабора.

Адным з першых рэстаўратараў беларускай керамікі, і асабліва кафлі, быў Уладзімір Угрыновіч (1941–1994). Гэта быў вядомы мастак-кераміст, выдатны выкладчык і даследчык народнай беларускай керамікі. З 1969 г. ён працаваў на кафедры керамікі Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута, доўгі час вывучаў івянецкую кераміку і засвоіў усе сакрэты мясцовых майстроў. Пачынаючы з 1977–1978 гг. ён зацікавіўся археалагічнай керамікай і пачаў вывучаць і аднаўляць керамічны посуд, кафлю і іншыя керамічныя вырабы з раскопак Лідскага, Мірскага, Крэўскага і Гальшанскага замкаў, Лагойска, Мінска, Віцебска і іншых гарадоў і мястэчак Беларусі [2]. Ён актыўна супрацоўнічаў з археолагамі М. Ткачовым, В. Собалем і аўтарам артыкула [2; 4].

У лютым 1993 г. у Беларускім універсітэце культуры была створана кафедра народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на чале з Рыгорам Шаурам. У 2001 г. была адкрыта асобная спецыялізацыя «рэстаўрацыя твораў ДПМ» на спецыяльнасці «дэкаратыўна-прыкладное мастацтва». У 2001 г. у Нацыянальным мастацкім музеі была зладжана выстава «Рэстаўрацыя і рэстаўратары». Да каталога выставы быў прыкладзены даведнік са звесткамі пра ўсіх рэстаўратараў, што працавалі з музейнымі артэфактамі Беларусі на працягу 1950–2000 гг.

Зараз рэстаўрацыйныя майстэрні Нацыянальнага мастацкага музея арганізоўваюць экскурсіі для ўсіх жадаючых і прапануюць пазнаёміцца з «Рэстаўрацыяй алейнага жывапісу», «Рэстаўрацыяй старажытнабеларускага мастацтва» і «Рэстаўрацыяй дэкаратыўнага-прыкладнога мастацтва і графікі».

Варта адзначыць і дзейнасць Андрэя Крапіўкі, які ўжо некалькі дзесяцігоддзяў займаецца рэстаўрацыяй старадрукаваных кніг. Ён аднавіў шмат унікальных экзэмпляраў, у тым ліку кнігі Францыска Скарыны. Іх можна ўбачыць у музейных экспазіцыях, у тым ліку і ў музеі Нацыянальнай бібліятэкі. Крапіўка таксама аднавіў Евангелле 1600 г. з друкарні братоў Мамонічаў у Вільні.

*1.* Абразы XVII–XIX стст. са збораў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка : каталог / [склад.: Л. М. Лысенка, Л. Л. Сысоева, А. А. Ярашэвіч]. – Мінск : Рыфтур, 2021. – 47 с.

*2.* Беларуская кафля / А. А. Трусаў [і інш.] ; пад рэд. С. А. Мілючэнкава. – Мінск : Беларусь, 1989. – 150 с.

*3.* Простейшая консервация музейных предметов в условиях музея на общественных началах : метод. рекомендации / сост. А. А. Маслыко. – Минск : Госмузей БССР, 1988. – 15 с.

*4. Трусаў, А. А.* Беларускія кафляныя печы / А. А. Трусаў // Беларус. гіст. часопіс. – 2016. – № 5. – С. 4–17.